*Аляксандр Карацееў*

**ЗАСВАЕННЕ ТРАДЫЦЫЙНЫХ НАРОДНЫХ ДУХАВЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ БЕЛАРУСАЎ ЯК УНІВЕРСАЛЬНАЯ СІСТЭМА ПАДРЫХТОЎКІ СУЧАСНЫХ ВЫКАНАЎЦАЎ СФЕРЫ ДУХАВОГА МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ**

*У артыкуле разглядаюцца пытанні, якія тычацца інтэрпрэтацыі музыкі. Інтэрпрэтацыя прааналізавана як спецыфічная з'ява, якая дазваляе выканаўцы раскрыць сутнасць музычнага твора. Аўтар адзначае, што падчас вызначэння сутнасці інтэрпрэтацыі музыкі неабходна ўлічваць: 1) стылістыку творчасці кампазітара, а таксама яго твору, які выконваецца; 2) мастацка-вобразнае мысленне выканаўцы ў дадзеным творы; 3) ступень падрыхтоўкі слухача да ўспрымання спецыфікі музыкі.*
*Зыходзячы з прафесійных інтарэсаў, аўтар выкладае сваё бачанне рэалізацыі інтэрпрэтацый музычных твораў ў кантэксце народнай музыкі і асаблівасці навучальнага працэсу падрыхтоўкі выканаўцаў на народых духавых і ударных інструментах вышэйшай кваліфікацы Беларусі.*

*Alexander Koroteev*

**MASTERING THE TRADITIONAL FOLK WIND INSTRUMENTS OF BELARUSS AS A UNIVERSAL SYSTEM OF TRAINING OF MODERN PERFORMERS IN THE SPHERE OF WIND ART OF BELARUS**

*The article discusses the current issues relating to the interpretation of music. Interpretation is seen as a specific form, allows the performer to discover the essence of music. The author notes that during the determination of the essence of the interpretation in the musical arts, consider the following components of this process: 1) the style of the composer and his work, which is carried out; 2) artistic and creative thinking in particular artist vykanaetym they work; 3) the degree of preparedness of the listener to perceive the specifics of musical art.*
*Based on professional interests, the author sets out his vision for the implementation of interpretations of musical works in the context of folk music performers and features educational process of preparation of the people of wind and percussion instruments of the highest qualification of Belarus.*

Традыцыйныя народныя духавыя музычныя інструменты займаюць асаблівае месца як у сусветнай мастацкай культуры [10, с. 296-320; 18; 19], так і ў нацыянальнай культуры Рэспублікі Беларусь [3, с. 168-176; 8, с. 65-75; 16; 17]. Яны з'яўляюцца не толькі архаічнымі, што само па сабе выклікае да іх цікавасць сучаснага чалавека. Яны – ярка выяўленыя атрыбуты нацыянальнай духоўнай і матэрыяльнай культуры Беларусі, ўнікальныя нацыянальныя арганалагічныя ідэнтыфікатары і транслятары дасягненняў нацыянальнай мастацкай культуры, якім характэрна спецыфічнае і непаўторнае тэмбрава-каларыстычнае і пераканаўчая градацыя дынаміка-акустычнага гучання ад p (акарына, дудка і саломка ў першай актаве) да f (пастуховая драўляная труба, рог, дуда і дудка) [11, с. 109-123; 12, с. 26-34; 14, с. 66-72]. Нягледзячы на сацыякультурную, нацыянальна-мастацкую значнасць традыцыйных народных духавых музычных інструментаў беларусаў, працэс падрыхтоўкі выканаўцаў на гэтых інструментах адрозніваецца пэўнымі складанасцямі і праблемамі [1; 2; 4, с. 138-146; 5, с. 375-377; 6, с. 18-21; 7, с. 165-166; 9, с. 119-122; 13, с. 87-94].

Зыходзячы з прафесійных інтарэсаў, мы вывучалі праблему папулярызацыі і засваення традыцыйных народных духавых музычных інструментаў беларусаў у кантэксце папулярызацыі і інтэпрытацыі народнай музыкі і асаблівасцей навучальнага працэсу падрыхтоўкі выканаўцаў вышэйшай кваліфікацы Беларусі на духавых і ўдарных інструментах. Маецца на ўвазе той навучальны працэсў выканаўцаў, які мэтанакіравана ажыццяўляецца ва ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» па асабнай спецыяльнасці: 1-16 01 06 «Духавыя інструменты (па напрамках)» напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06 – 11 «Духавыя інструменты (народныя)».

Сярод спецыяльных курсаў тыпавога вучэбнага плана па падрыхтоўцы спецыялістаў духавога мастацтва вычэбная дысцыпліна «Дадатковы народны інструмент» з'яўляецца адной з састаўных музычна-творчых дысцыыплін па падрыхтоўцы выканаўцаў на сучасных аркестравых і ансамблевых духавых і ўдарных музычных інструментах па спецыялізацыі 1-18 01 01-02 Народная творчасць (інструментальная музыка). Але, на нашу думку, авалоданне студэнтамі навыкамі ігры на народных духавых і ўдарных музычных інструментах у межах гэтай вуэбнай дысцыпліны падчас навучальнага працэсу спрыяе пашырэнню ў іх універсальных прафесійных ведаў, навыкаў і ўменняў як будучых шырокапрофільных спецыялістаў музычнага мастацтва вышэйшай кваліфікацыі не толькі па сваёй базавай адукацыі спецыялізацыі 1-18 01 01-02 Народная творчасць (інструментальная музыка).

Гэта абумоўлена тымі абставінамі, што пасля заканчэння вышэйшай установы студэнты гэтай спецыяльнасці будуць працаваць у сферы духавога мастацтва ці ў якасці кіраўнікоў аматарскіх аркестраў духавых і ўдарных інструментаў, ці выкладчыкамі навучальных устаноў, ці працаваць як выканаўцы у прафесійных аркестравых калектывах. І таму будучым спецыялістам мэтазгодна засвоіць трывалыя навыкі выканаўства на традыцыйных беларускіх народных духавых інструментах таму, што атрыманыя імі ўнікальныя навыкі ігры могут быць рэалізаваны ў асабістай выканальніцкай практыкі як салістаў у творах пад акампанемент аркестра духавых і ўдарных інструментаў, ці ў складзе аматарскіх, вучэбных народна-інструментальных калектываў (капелы, аркестры, ансамблі).

Таксама, атрымаўшы такія выканальніцкія навыкі, выпускнікі могут спадзявацца і на дадатковы заробак па сумяшчанню ў той ці іншай навучальнай установе. Яны будуць у здольнасці ажыццяўляць заняткі з навучэнцамі на асноўным традыцыйным беларускім народным духавым інструменце, як беларуская дудка (але магчыма – і на нейкім іншым інструменце, як акарына, жалейка, саломка). Таму падчас арганізацыя выкладчыкамі заняткаў са студэнтамі спецыялізацыі 1-18 01 01-02 Народная творчасць (інструментальная музыка) па дысцыпліне «Дадатковы народны інструмент» неабходна памятаць, што яны спрыяюць фарміраванню ў студэнтаў навыкаў выканальніцтва на беларускіх народных духавых інструментах на лепшых узорах традыцыйнай фальклорнай і сучаснай народнай музыкі. Неабходна адзначыць, што ідэя неабходнага паралельнага ўніверсальнага навучання, напрыклад, саксафаністаў і іх авалоданне навыкамі ігры на кларнеце, не нова. Такую праблему, напрыклад, пра неабходнасць арганізацыі ўніверсальных творча-педагагічных падыходаў у працэсе падрыхтоўкі саксафаністаў для духавых аркестраў разгледзіл у сваім артыкулу А.Мохаў [15, с. 191-194].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзякуючы матэрыялам вучэбнай дысцыпліны «Дадатковы народны інструмент», навучанне на традыцыйных беларускіх народных духавых інструментах будзе спрыяць таксама развіццю ў студэнтаў самастойнасці мастацка-вобразнага мыслення, ўсебаковаму развіццю творчай індывідуяльнасці будучага спецыяліста духавога мастацтва. І, зразумела, менавіта спецыяліст з такой універсальнай падрыхтоўкай будзе здольны выконваць камерна-інструментальные, ансамблевыя ці аркестравыя творы у складзе калектыва як на асабістам базавым духавым інструменце (флейта, кларнет, саксафон, труба, трамбон і інш.), так і на беларускім традыйным народным духавым інструменце (дудка, дуда, акарына, саломка, старажытная пастуховая драўляная труба і інш.).

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Дадатковы народны інструмент» будучымі ўніверсальнымі спецыялістамі сферы духавога мастацтва дазволіць студэнтам вырашыць шырокае кола музычна-тэарэтычных і творча-выканальніцкіх задач па асабістай спецыфічнай падрыхтоўцы на традыцыйных народных духавых інструментах. Сярод іх: 1) засвоіць неабходныя веды у сферы духавога музычнага мастацтва па ўсіх існуючых сучасных інструментальна-выканальніцкіх формах; 2) сольнае, ансамблевае і аркестравае (капельнае) выканальніцтва; 3) развіць неабходныя асабістыя творча-выканальніцкія навыкі з мэтай іх адпаведнага выкарыстання ў будучай прафесійнай самастойнай мастацка-выканальніцкай ці педагагічнай дзейнасці па папулярызацыі, развіццю і ўмацаванню выканальніцкіх традыцый на традыцыйных народных духавых інструментах і духавога ансамблевага, капельнага, аркестравага выканальніцтва ўвогуле; 4) арыентыравацца у выбары неабходных аптымальных творча-выканальніцкіх рашэнняў у класічных творах, ў творах сучасных кампазітараў па дамоўленнасці з выкладчыкам для вывучаемага народнага духавога інструмента падчас падрыхтоўкі акадэмічнай праграмы для іспытаў (кантрольны урок, сесіённы іспыт) ці з кіраўніком вучэбнага калектыва для канцэртных выступленняў у складзе ансамбля, аркестра; 5) ўсвядоміць для сябе сутнасць сацыякультурнай значнасці і прэстыжу, папулярнасці і мастацка-выразных асаблівасцей выканальніцтва на традыцыйных народных духавых інструментах.

На наш погляд, асноўнымі задачамі вучэбнай дысцыпліны «Дадатковы народны інструмент» павінны быць наступныя: 1) атрыманне неабходных ведаў ў народна-інструментальным кірунку музычнага мастацтва; 2) развіццё адпаведных творча-выканальніцкіх навыкаў ў асабістай мастацка-прафесійнай дзейнасці; 3) уменне састаўляць планы самастойнай работы па засваенню асноў выканальніцкага майстэрства на беларускіх народных духавых інструментах, уключаючы інструктыўны матэрыял – практыкаванні, гамы, эцюды, мастацка-творчый матэрыял – камерна-інструментальныя творы, партыі ансамблевых ці аркестравых (капельных) твораў, сольныя партыі ў суправаджэнні аркестра духавых і ударных інструментаў; 4) самастойнае вызначэнне ансамблевых ці аркестравых цяжкасцей і неабходнасць ажыццяўлення адпаведнай работы па іх дакладнаму выкананню; 5) дакладнае ажыццяўленне настройкі таго ці іншага музычнага інструмента з дапамогай цюнара ці фартэпіяна; 6) ажыццяўленне пошукаў найбольш эфектыйных канцэртных увасабленняў народнай традыцыйнай музыкі і сучасных аўтарскіх твораў народна-інструментальнага мастацтва; 7) спрыянне сацыякультурнаму прэстыжу народна-інструметальнай спадчыны Беларусі і развіццю айчынных народна-інструментальных выканальніцкіх традыцый.

Адзначым, што падчас перыяду навучання ва ўніверсітэце па вучэбнай дысцыпліне «Дадатковы народны інструмент» студэнты павінны атрымаць дастатковыя веды, якія забяспечаць іх выканальніцкую падрыхтоўку на свістковых, язычковых ці амбушурных беларускіх традыцыйных народных духавых інструментах (класіфікацыя, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці асноўных беларускіх народных духавых інструментаў; сутнасць і змест этапаў сольнага выканаўства ў суправаджэнні фартэпіяна, ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў).

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павіненны ведаць наступныя пытанні: а) тыпалогію, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці асноўных народных, народных духавых лабіяльных, язычковых, (іх класіфікацыя па сусветнай сістэме Закса-Хорнабостэля з улікам сучасных  разнастайнасцей; мастацка-выканальніцкія і выразна-тэхнічныя магчымасці; строй; натацыя; дыяпазон і г.д.); б) спецыфіку сольнага выканаўства (solo; solo у суправаджэнні фартэпіяна; solo у суправаджэнні інструментальнага ансамбля, народнага аркестра ці аркестра духавых інструментаў); с) псіхолага-педагагічныя і арганізацыйна-метадычныя аспекты засвоення духавых інструментаў у адпаведнасці з атрыманнем кваліфікацыі «Выкладчык»; д) віды і неабходныя этапы работы над музычнымі творамі (папярэдняя аналітычная работа па вывучэнню вызначанага для працы матэрыяла; музычна-выканальніцкі аналіз вывучаемых твораў; змест адпаведнага графіка па вывучэнню найбольш складаных фрагментаў выконваемых твораў; асноўные этапы і іх паслядоўнасць; прынцыпы работы над асабістым творам ці іх камбінацыямі); е) выкананне варыянтаў, трактовак, інтэрпрэтацый, рэдакцый, музычных твораў (параўнальны аналіз музычнага матэрыялу з улікам вывучэння арыгінала твораў ці яго адаптацыі – нотныя выданні, відэазапісы і г.д.); ж) эфекты мастацка-выразных магчымасцей духавых лабіяльных, язычковых і амбушюрных інструментаў (solo, кантрапункт, музычная арнаментыка, сучасныя прыёмы ігры і г.д.); з) асаблівасці арганізацыі канцэртна-выканальніцкай дзейнасці выканаўцаў на  духавых лабіяльных, язычковых і амбушурных інструментах і іх сацыякультурная значнасць.

Акрамя гэтага, падчас вывучэння дысцыпліны студэнты павінны удасканальваць наступныя ўменні: арганізаваць неабходныя самастойныя ранішнія заняткі з мэтай падрыхтоўкі і актывізацыі выканальніцкага апарату; самастойна настройваць свой інструмент і ажыццяўляць неабходныя карэктуры пры недакладным інтанаванні, збалансаванне дынаміка-акустычнага гучання ў працэсе сумеснага выканання твора ў суправаджэнні фартэпіяна ці ў складзе ансамбля, аркестра духавых і ударных інструментаў; вызначыць абавязковыя папярэднія заняткі з мэтай падрыхтоўкі і актывізацыі выканальніцкага апарату да выканання заданняў; дакладна выконваць абертоны; рабіць неабходныя карэктуры пры недакладным інтанаванні; складаць планы па арганізацыі самастойнай работы над інструктыўным матэрыялам (практыкаванні, гамы, эцюды, творы); састаўляць планы самастойнай работы над музычнымі творамі па індывідуальнай падрыхтоўцы; вызначаць ансаблевыя ці аркестравыя цяжкасці і планаваць неабходную работу па іх дакладнаму выкананню; валодаць тэхналогіяй асноўных штрыхоў, прыёмаў, манеры гучання, элементамі выканальніцкага майстэрства на беларускіх народных духавых інструментах і арыентавацца ў вызначэнне спецыфікі пабудовы і адпаведнага выканання фразіроўкі ў залежнасці ад жанравай накіраванасці твораў; расшыфроўваць і дакладна выконваць метра-рытмічную структуру музычнай арнаментыкі (трэлі, групета, мардэнты і г.д.).

Выкладчыкі павінны вызначыць і аптымальны змест навучання студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Дадатковы народны інструмент». Падчас навучання студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыка павінны авалодаць асновамі выканання на наступных традыцыйных народных духавых інструментах: храматычнай дудцы (сапрана in C); шэрагу дадатковых духавых інструментаў – акарыне, храматычнай жалейке, дудзе (in D, in G), саломцы, старажытнай пастуховай драўлянай трубе, рогу і інш.

Авалоданне наступнымі абавязковымі інструментамі ажыццяўляецца па дыдактычнаму прынцыпу ад простага да складанага і адпаведна размяркоўваецца наступным чынам па вучэбных семестрах: (I) – дудка сапрана in C, акарына in C (in G); (II) – жалейка in G (in D); (III) – жалейка in G (in D), дуда in D (in G); (IV) – дуда in D (in G), старажытная пастуховая драўляная труба, рог і інш.

Падрыхтоўка студэнтамі заданняў падчас штодзенных аўдыторных, а таксама і пазааўдыторных самастойных заняткаў на беларускіх традыцыйных народных духавых свістковых, язычковых і амбушурных інструментах, прадугледжвае штосеместровую



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

атэстацыю па выкананні сольных вучэбных праграм (solo; solo у суправаджэнні фартэпіяна; выкананне партый ансамблевых і аркестравых твораў).

З мэтай аптымальнай арганізацыі навучальнага працэсу па засваенню студэнтамі выканальніцкіх навыкаў на беларускіх традыцыйных народных духавых свістковых, язычковых і амбушурных інструментах мы прапануем наступны прыкладны тэматычны вучэбны план:

| № п/п | Н А З В А Т Э М Ы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | лекц. | практ. | Усяго |
| . | ***Уводзіны*** | | 2 | **2** |
| | **Раздзел І.** ***Этнааргалагічныя асаблівасці і састаўныя часткі традыцыйных народных духавых інструментаў*** | | | **2** |
| Тэма 1. | Засваенне этнааргалагічных асаблівасцей традыцыйных народных духавых і ударных музычных інструментаў | | 1 | 1 |
| Тэма 2. | Вывучэнне галоўных састаўных частак беларускіх традыцыйных народных духавых і ударных музычных інструментаў | | 1 | 1 |
| | **Раздзел ІІ.** ***Творча-практычныя аспекты засваення выканальніцкіх навыкаў ігры на традыцыйных народных духавых інструментах*** | | | **66** |
| Тэма 3. | Асаблівасці засваення функцыянальных асноў гукаатрымання на беларускіх традыцыйных народных духавых музычных інструментах | | 8 | 8 |
| Тэма 4. | Вывучэнне сістэмы настройкі беларускіх традыцыйных народных духавых інструментаў і развіццё навыкаў настройкі беларускіх народных духавых інструментаў у працэсе выканання | | 4 | 4 |
| Тэма 5. | Засваенне штрыхоў, традыцыйных і спецыфічных прыёмаў гуказдабывання на беларускіх традыцыйных народных духавых інструментах | | 8 | 8 |
| Тэма 6. | Работа над фразіроўкаў пры ігре на беларускіх традыцыйных народных духавых інструментах | | 6 | 6 |
| Тэма 7. | Развіццё навыкаў выкарыстання дынаміка-акустычнага балансу пры выкананні на беларускіх традыцыйных народных духавых інструментах | | 4 | 4 |
| Тэма 8. | Асаблівасці работы над метрарытмічнымі цяжкасцямі пры выкананні на беларускіх народных духавых інструментах | | 4 | 4 |
| Тэма 9. | Развіццё навыкаў чытання нот з ліста пры выкананні на беларускіх народных духавых інструментах | | 4 | 4 |
| Тэма 10. | Засваенне вучэбна-педагагічнага і канцэртнага рэпертуара для беларускіх традыцыйных народных духавых інструментаў | | 8 | 8 |
| Тэма 11. | Вывучэнне сольных канцэртных музычных твораў для беларускіх традыцыйных народных духавых інструментаў у суправаджэнні з духавым аркестрам | | 8 | 8 |
| Тэма 12. | Вывучэнне ансамблевых і аркестравых партый музычных твораў для беларускіх традыцыйных народных духавых інструментаў у у суправаджэнні з духавым аркестрам | | 6 | 6 |
| Тэма 13. | Развіццё навыкаў падрыхтоўкі да канцэртна-выканальніцкай дзейнасці выканаўцаў на беларускіх традыцыйных народных духавых інструментах | | 6 | 6 |
| | ***УСЯГО:*** | | ***70*** | ***70*** |

Такім чынам, падрыхтоўка выканаўцаў на сучасных аркестравых і ансамблевых духавых і ўдарных музычных інструментах па спецыялізацыі 1-18 01 01-02 Народная творчасць (інструментальная музыка) ва ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», акрамя асабістага базавага музычнага інструмента, павінна прадугледжваць абавязковую выканальніцкую падрыхтоўку студэнтаў па засваенні выканальніцкіх навыкаў на традыцыйных народных духавых музычных інструментаў беларусаў. Гэта – актуальнае патрабаванне сучаснага развіцця нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі і духавога мастацтва.

**Спіс літаратуры:**


1. Гром, У.М. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. : у 2 ч. / У.М. Гром, А.Я. Крамко, І.А. Мангушаў. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005.– Ч. 1. Сольнае выкананне. – 259 с.
2. Гром, У.М. Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. : у 2 ч. / У.М. Гром, А.Я. Крамко, І.А. Мангушаў. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 2. Ансамблевае выкананне. – 217 с.
3. Коротеев, А.Л. Бытование амбушюрных духовых музыкальных инструментов в Беларуси (по материалам археологических изысканий, архивных исследований и анализа печатных изданий в контексте славянской органологии) / А.Л. Коротеев // IV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў (Мінск, 24-26 мая 1998 г.): у 2 ч. / ЕГУ, Бел. ун-т культуры ; рэдкал. Пазнякоў А.У. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Бел. ун-т культуры, 1999. – Ч. 2. – С. 168–176.
4. Коротеев, А.Л. Генезис образования специалистов духового исполнительского искусства Беларуси (народно-инструментального, профессионального и любительского) / А.Л. Коротеев // Музыкальное искусство и музыкальное образование на рубеже веков: Материалы научных конференций «Беларусь и музыкальное наследие ХХ столетия: поиски и обретения» (29-30 ноября 2001 г., Минск), «Музыкальное образование в контексте художественной культуры» (10-11 декабря 2002 г., Минск). – Вып. 1. – Минск: Белорусская государственная академия музыки, 2004. – С. 138-146.
5. Коротеев, А.Л. Дисбаланс квалификационно-педагогических компонентов системы подготовки специалистов профессионального и любительского духового искусства Беларуси / А.Л. Коротеев // Проблемы развития педагогического образования: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 17 дек. 2004 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол.: А.В. Торхов (отв. ред.) [и др.].– Минск: БГПУ, 2005. – С. 375–377.
6. Коротеев, А.Л. Использование функционально-ролевых игр в процессе подготовки специалистов духового искусства высшей квалификации Беларуси (народные и оркестровые духовые, ударные инструменты) / А.Л. Коротеев // Игровые технологии в современном воспитательном процессе : материалы Респ. науч.-практ. конф., Мозырь, 12–13 февр. 2004 г.: в 3 ч. – Мозырь: МГПУ, 2004. – Ч. 1. – С. 18–21.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Коротеев, А.Л. Мотивационные и аттестационно-квалификационные аспекты вузовской системы подготовки исполнителей на белорусских народных духовых музыкальных инструментах / А.Л. Коротеев // Высшая школа: проблемы и перспективы : материалы 6-й Междунар. науч.-метод. конф., Минск, 23-24 ноября 2004 г. – Минск : РИВШ, 2004. – С. 165–166.
8. Коротеев, А.Л. Народные духовые инструменты беларусов как объекты научных исследований национальной и всемирной этноорганологии в контексте европейской культуры / А.Л. Коротеев // Orkiestry dete w kulturze europejskiej: materialy z konferencji naukowej 20 –22.06.2015 Lobez. – Nr. 3; pod red. Bogdana Matlawskiego / Zwerciadlo etnologiczne rocznik katedry etnologii i antropologii kulturowej uniwersytetu Szczecinskiego. – Szczecin: Wydawnictwo naukowe uniwersytetu Szczecinskiego, 2016.– S. 65 – 75.
9. Карацееў, А.Л. Неардынарная з’ява нацыянальна-выканальніцкага адраджэння / А.Л. Карацееў // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. – 2005. – № 5. – С. 119–122.
10. Коротеев, А.Л. Особенности развития духового искусства Восточной Европы: органологическое исследование и эволюция форм народно-инструментального исполнительства на духовых и ударных инструментах / А.Л. Коротеев // Українська культура в іменах і дослідженнях: наукові записки Рівненьского державного інституту культури. – Рівне: Рівненський державний інститут культури, 1998. – Віп. 3. – С. 296–320.
11. Коротеев, А.Л. Традиционные народные духовые инструменты белорусов как трансляторы достижений национальной художественной культуры / А.Л. Коротеев // Folklor, folkloryzm, Folk / pod red. Malgorzaty Kowalik i Bogdana Matlawskiego. – Szczecin, 2016. – S. 109-123.
12. Коротеев, А.Л. Трансформация художественно-творческих форм инструментовки и интерпретации произведений духового искусства в условиях глобализации культуры (белорусские народные и современные оркестровые духовые инструменты) / А.Л. Коротеев // Сб. науч. тр. по материалам междунар. науч.-практ. конф. «Перспективные инновации в науке, образовании, производстве и транспорте ‘2007».– Одесса: Черноморье, 2007.– С. 26-34. – Т. 16. История и архитектура, гос. упр., физ. воспитание и спорт, туризм и рекреация.
13. Коротеев, А.Л. Фольклорные духовые инструменты белорусов в этнокультурном воспитании и художественном образовании детей и молодёжи (от музыкальной игрушки до разнообразия национального инструментария) / А.Л. Коротеев // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання): зб. навук. арт. / склад. і навук. рэд. І.І. Сучкоў. – Мінск: Бестпринт, 2004. – С. 87–94.
14. Коротеев, А.Л. Функциональные и этноорганологические особенности белорусских народных духовых инструментов / А.Л. Коротеев // X Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24–26 мая 2004 г.) / рэдкал. М.А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 66–72.
15. Мохов, А.С. Проблемы организации универсальных творческо-педагогических подходов в процессе подготовки саксофонистов для духовых оркестров (на примере учебно-воспитательного процесса на кафедре духовой музыки факультета музыкального искусства БГУКИ) / А. С. Мохов // Актуальные проблемы мировой художественной культуры. – В 2 ч. – Ч. 1: сб. науч. статей / Учреждение образования / "Гродненский гос. ун-т им. Я. Купалы"/; гл. ред. Т.Г. Барановская; ред. кол.: Т.Г. Барановская, А.А. Брагина, А.И. Бурчик, И.Ф. Двужильная, А.А. Лещинский. – Гродно: ГрГУим. Я. Купалы, 2018. – С. 191-194;
16. Назина, И.Д. Белорусские народные музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые / И.Д. Назина ; под ред. М.Я. Гринблат. – Минск: Наука и техника, 1979. – 144 с.
17. Назіна, І.Д. Беларускія народныя музычныя інструменты / І.Д. Назіна. – Мінск: Беларусь, 1997. –239 с.
18. Народные музыкальные инструменты и инструментальная музыка: сб. ст. и материалов: в 2 ч. / сост. И.В. Мациевский; под общ. ред. Е.В. Гиппиуса. – М.: Сов. композитор, 1987. – Ч. 1. – 264 с.
19. Народные музыкальные инструменты и инструментальная музыка : сб. ст. и материалов : в 2 ч. / сост. И.В. Мациевский; под общ. ред. Е.В. Гиппиуса. – М.: Сов. композитор, 1988. – Ч. 2. – 327 с.

***Валентина Ушакова***

## ЭТНОХУДОЖЕСТВЕННОЕ ОБРАЗОВАНИЕ В СОЦИАЛЬНО-КУЛЬТУРНОМ ФОРМАТЕ ИННОВАЦИОННОЙ ЭКОНОМИКИ

*Образование в высокоразвитых странах детерминируется уровнем развития новых знаний. Данная тенденция проявляется в наших условиях. Прежде всего, она связана с превращением нового знания в реальную производительную силу общества и находит отражение в совершенствовании организационно-содержательных аспектов образования Беларуси, в том числе и этнохудожественного.*

***Valentina Ushakova***

## ETHNO-ART EDUCATION IN THE SOCIO-CULTURAL FORMAT OF INNOVATIVE ECONOMY

*Education in highly developed countries is determined by the level of new knowledge development. This trend is manifested in our conditions. First of all, it is connected with the transformation of new knowledge into the real productive force of society and is reflected in the improvement of the organizational and belarusian education substantive aspects of the education, including the ethno-artistic.*

Социально-экономическое развитие Беларуси обеспечивают на данном этапе, как традиционные отрасли, так и инновационные технологии. Среди которых в качестве приоритетов рассматриваются социогуманитарные технологии, определяющие развитие общества, государства, человека. Направлены они, в основном, на приумножение историко-культурных и общегуманистических ценностей, а также развитие высокого интеллекта нации [1, с. 3–28]. Этнохудожественное образование, направленное на «сохранение и передачу последующим поколениям бесценного богатства национальной культуры» [7] в этой связи является чрезвычайно перспективным.

Развитие инновационных отраслей экономики находится под влиянием многочисленных факторов, таких как глобализация, интернационализация, демографические изменения, междисциплинарный характер деятельности специалистов, а следовательно, рост требований к их компетентности и другие. Влияние перечисленных факторов на социально-экономическое развитие проявляется, прежде всего, в конкурентности производства, темпах роста, взаимодействии системы образования и рынка труда, вопросах национальной безопасности и так далее.

На уровне дефиниции «этнохудожественное образование – это процесс и результат подготовки обучающегося к занятию профессиональным художественным творчеством, обеспечивающие осознание личностью необходимости национальной самоидентификации через освоение специальных знаний, умений и навыков в определенной области искусства и сохранение

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ